# ИСТОРИКО-КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ТУРИЗМА И ГОСТЕПРИИМСТВА

УДК 379.85



**Г.С. КАСЯНОЎСКАЯ**, канд. гіст. навук
дацэнт кафедры сацыялогіі і спецыяльных
сацыялагічных дысцыплін
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 2 апреля 2021 г.*

## МЯСТЭЧКІ ЯК АСЯРОДКІ ТУРЫЗМУ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921-1939 ГГ.)[1]

*Автор в научном исследовании акцентирует внимание на том, что местечки наряду с городами в 1921-1939 гг. были включены в сферу туризма. Некоторые из них стали курортными центрами Западной Беларуси в межвоенный период. В статье обосновывается мысль о том, что местечки обладали определенным комплексом культурно-исторических, природных, социально-экономических, транспортных ресурсов, совокупность которых весьма активно использовалась польским государством, местным самоуправлением и местечковыми жителями для организации туристической деятельности. По мнению автора, большинство факторов туристической привлекательности были направлены на прибытие в данные населенные пункты значительного числа отдыхающих из других воеводств Польши. В связи с этим, въездной и внутренний туризм в Западной Беларуси доминировали над выездным. Несмотря на это, туристическая инфраструктура местечек по качественным и количественным показателям в значительной степени уступала инфраструктуре в городах. Автором подчеркивается, что в 30-е гг. XX века строительство в местечках летних домиков для отдыха, пансионатов, туристических баз отдыха, сдача в аренду частных дач, усадеб превращали местечки в центры агротуризма, что позволило увеличить поток туристов и на постоянной основе принимать отдыхающих.*
*В статье рассматривается специфика и условия развития туризма в местечках Западной Беларуси в 1921-1939 гг. Характеризуется включенность местечек в наиболее популярные туристические маршруты основных регионов Беларуси – Виленщины, Понеманья, Полесья. Раскрываются отдельные направления туризма, которые получили развитие и определили туристическую привлекательность белорусских местечек.*

***Ключевые слова:*** *туризм, местечки, региональный туризм, Западная Беларусь, Польша, межвоенный период, туристический потенциал.*

**KASIANOUSKAJA Hanna S.,** PhD in Hist. Sc.
Associate Professor of the Department of Sociology and Special Sociological Sciences
Grodno State University, Republic of Belarus

[1] Статья публикуется в авторской редакции.

## TOWNSHIPS AS CENTERS OF TOURISM IN WESTERN BELARUS (1921-1939)

*The scientific article is devoted to the development of tourism in Western Belarus in 1921-1939. The article focuses on the fact that not only cities, but also townships in 1921-1939 were included in the tourism industry. The townships has a certain set of cultural, historical, natural, socio-economic, transport resources, the totality of which was used by the Polish state, local government and local residents to organize tourism activities. According to the author, most of the factors of tourist attraction have been focused at the development of inbound and domestic tourism. The author emphasizes that in the 30s of the twentieth century, the construction of summer cottages for recreation in the townships, the leasing of private dachas and estates turned the townships into centers of agritourism, thus increasing the flow of tourists and on an ongoing basis to take a rest.*
*The purpose of scientific research is to determine the specifics and conditions for the development of tourism in the townships of Western Belarus in 1921-1939. The article also characterizes the inclusion of townships in the most popular routes of the main regions of Belarus – Vilenshina, Ponemania, Polesie. There are revealed some areas of tourism, which have been developed and defined tourist attraction Belarusian townships.*

***Keywords:*** *tourism, townships, regional tourism, Western Belarus, Poland, the interwar period, the tourism potential.*

**Уводзіны.** Мястэчка – шырока распаўсюджаны тып паселішча, невялікі гарадок. У 1921 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўвайшла ў склад польскай дзяржавы, налічвалася 198 мястэчак, з іх у Беластоцкім ваяводстве – 31, Віленскім – 81, Навагрудскім – 54, Палескім – 32 [1, с. 4]. Польскія ўлады бачылі ў мястэчках своеасаблівую зону абмену (эканамічную, інфармацыйную, сацыяльна-культурную) паміж горадам і вёскай. Многія з іх сталі эканамічнымі, сацыяльна-культурнымі цэнтрамі гмін і паветаў. Мястэчкі, якія колькасна перавышалі гарады, выступалі асяродкамі турызму, некаторыя з іх сталі курортнымі цэнтрамі заходнебеларускага рэгіена.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі пытанням развіцця турызму ў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. прысвечана некалькі прац. Неабходна адзначыць манаграфію У. Ганскага [2], шматлікія абагульняючыя артыкулы навукоўцаў і краязнаўцаў: У. Ганскага [3], А. Ільна [4], П. Ціхарадскага, І. Мельнікава, К. Шыталя, В. Садоўскага [5]. Аднак, мэта дадзенага даследавання – зрабіць акцэнт менавіта на такіх паселішчах як мястэчкі, паказаць іх ролю як асяродкаў турызму ў 20-30 гг. XX ст.

**Асноўная частка.** Пачатак XX ст. вызначыў шмат новых накірункаў у развіцці турызму. Турызм у польскай дзяржаве стаў інстытуцыянальнай галіной гаспадаркі. Пытаннямі турызму займалася Міністэрства ўнутраных спраў. У кожным ваяводскім цэнтры пры ўпраўленні былі створаны аддзелы турызму, працавалі ваяводскія турыстычныя камісіі. З’явіліся і першыя сталыя арганізацыі і таварыствы, створаныя для арганізацыі турыстычнай дзейнасці і продажу турыстычных паслуг. Значная іх колькасць працавала на камерцыйнай аснове. У 1934–1936 гг. пачалі пленную працу: Саюз турысцкай прапаганды Навагрудскай зямлі, Віленшчыны, Саюз развіцця турызму Беласточчыны, Палескі Саюз развіцця турызма. Дадаткова ў сваей дзейнасці турызм развівалі: Польскае краязнаўчае таварыства і яго мясцовыя аддзелы, Таварыства развіцця ўсходніх зямель, Віленскае і Гродзенскія таварыствы аматараў навук і інш. Усе адзначаныя арганізацыі актыўна займаліся распрацоўкай турыстычных маршрутаў, пошукам інвестараў і рэкламай турыстычных паслуг. Выданне дастатковай колькасці брашур, альбомаў фатаздымкаў і шляхаводнікаў па асобным ваяводствам і паветам, а таксама карт дарожнага руху, рэклама ў прэсе значна пашырала магчымасці турызму ў Заходняй Беларусі.

Значную ролю ў прапагандзе воднага турызму ў Заходняй Беларусі адыграў Саюз польскіх настаўнікаў, гродзенскія члены якога першымі распрацавалі турыстычныя шляхаводнікі па рэкам і каналам Гродзеншчыны.

Для прыцягнення турыстаў Таварыства развіцця ўсходніх зямель у 1934 г. запусціла акцыю *“Лета на усходніх землях”*. У рамках гэтай акцыі турыстам, якія наведвалі беларускія гарады і мястэчкі, прапаноўваліся

зніжкі да 75% на праезд чыгуначным транспартам. Для школьнай моладзі ў 1937-1938 гг. Таварыства запусціла чарговую зімовую акцыю *“Спартыўныя зімовыя забавы на Віленшчыне”*. Падчас школьных канікул і свята Раства ўдзельнікам прапаноўваліся зніжкі да 50% на праезд чыгункай і на пражыванне ў школьных пансіянатах. Як вынік за 1937 г. па акцыям ў Заходнюю Беларусі трапіла 11 000 турыстаў [6, с. 80].

Прыватныя польскія турфірмы наладзілі сталае супрацоўніцтва з мясцовымі саюзамі і таварыствамі, аказвалі ім фінансавую падтрымку для арганізацыі ўязнога (міжнароднага) турызму ў заходнебеларускім рэгіене. Так, дзякуючы сумеснай працы і фінансавай падтрымцы варшаўскага турыстычнага бюро «Orbis», беластоцкай турыстычнай фірмы “Kassandra” былі арганізаваны летнія базы адпачынку ў раёнах азер і рэк: Нёман, Нарачы, Свіцязі, Аўгустоўскага канала і зімовыя – ў Белавежскай і Налібоцкай пушчах.

Найбольшы расцвет турызму ў Заходняй Беларусі прышоўся на 30-я гг. XX ст. Пачынаючы з 1932 г. штогод беларускія мястэчкі маглі наведаць ад 2000 да 4000 турыстаў. У 1935 г. крыніцы фіксуюць, што нават Палескае ваяводства, якое вызначалася слабой сеткай чыгункі і дарожнага пакрыцця, наведала каля 2,5 тыс. турыстаў [6, с. 151]. Такі турызм нельга назваць масавым, аднак умовы, якія былі створаны дзеля яго развіцця, давалі магчымасць прымаць адпачываючых на пастаяннай аснове і на досыць працяглы час.

Да сярэдзіны 30-х гадоў у Заходняй Беларусі было распрацавана каля 250 турыстычных маршрутаў, якія групаваліся па чатырох турыстычных рэгіенах: Віленшчына, Палессе, Гарадзеншчына, Навагрудчына [3, с. 14]. Каля 130 мястэчак былі ўключаны ў гэтыя маршруты. Турыстычныя маршруты, як правіла, былі аднадзённымі ці шматдзённымі.

Асновай для фарміравання сеткі турыстычных маршрутаў Віленшчыны, Навагрудчыны і Беласточчыны сталі чыгунка і аўтобусная камунікацыя. Найбольш цікавыя аб’екты і населеныя пункты Палескага ваяводства можна было наведаць, падарожнічаючы воднымі траспартнымі сродкамі.

У 30-я гг. XX ст. у мясцовай друкарні “Магата” у Браславе быў выпушчаны першы даведнік для аматараў турызму па Браслаўскаму павету, асобнікі якога тыражаваліся па многіх польскім турыстычным фірмам. Былі распрацаваны і сталі папулярнымі некалькі водных і аўтобусных маршрутаў па Браслаўскаму павету. Такія мястэчкі, як Плюсы, Ёды, Слабодка, Іказнь, Новы Пагост, Перабродздзе, Міёры, Даўгінава, Друя, Дукшты сталі значнымі кропкамі маршрутаў, дзе ладзіліся экскурсіі і арганізоўваўся начлег. У Слабодцы, напрыклад, жадаючыя маглі не толькі пераначаваць, але і наведаць дзеючыя пры размешчанай там вайсковай часцы афіцэрскае казіно, рэстаран і кавярню.

Папулярным турыстычным маршрутам па замкавай культуры Навагрудчыны быў маршрут *(т.з. “Радзівілаўскі шлях”)*: *Навагрудак–Карэлічы–Турэц–Мір–Нясвіж–Клецк.* Штогод больш за 1000 турыстаў з усёй Польшчы наведвалі мястэчкі Мір, Турэц, Карэлічы. Турысты, якія жадалі самастойна наведаць славутасці Міра і Нясвіжа, выходзілі на чыгуначнай станцыі мястэчка Гарадзея, адкуль аўтобусамі можна было дабрацца да Нясвіжа за 1 злоты 50 грошаў. У Гарадзеі турыстам для начлега былі даступны гасцінніцы (“Варшаўская”, “Брыстоль”, “Еўропа”), апартаменты (А. Анішчук), рэстаран, кафэ, карчма.

Па каналах і рэках Віленшчыны і Палесся найбольш папулярнымі турамі былі двухдзенныя экскурсіі па маршрутам: *Пінск–Давід-Гарадок–Лунінец, Пінск–Кобрын–Ружаны–Высока-Літоўск*; *Вільна–Веркі–Ляндварава–Трокі; Вільна–Мікуны–Лаварышкі–Міхалішкі–Свір–Кабыльнік–Мядзел; Вільна–Браслаў–Друя–Дзісна* і інш.

Самым усходнім турыстычным маршрутам ва ўсей міжваеннай Польшчы быў маршрут з Глыбокага ў Дзісну. Маршрут быў сухапутны, працягласцю каля 75 км. Турысты па гэтаму маршруту заўседы наведвалі мястэчкі Лужкі і Германавічы, дзе маглі агледзець касцёл і кляштар піяраў 1756 г. і касцёл Праабражэння Гасподняга 1887 г. [3, с. 16].

Турыстаў у мястэчках цікавілі кірмашы, выставы народных вырабаў, помнікі гісторыі, прамысловыя прадпрыемствы, фальваркі, мясцовыя школы. Аматары замкавай культуры наведвалі мястэчкі Ляхавічы, Мір, Крэва, Нямечын, Трабы, Друю, Гальшаны, Іказнь, Свір. На Беласточчыне у Ротніцу турыстаў вазілі на магілу вядомага філамата Яна Чачо-

та, пахаванага ў 1846 г. У Лыскава падарожнікі наведвалі магілу польскага паэта Ф. Карпіньскага, аўтара песні “Калі рана ўстаюць зоркі”, якая стала папулярным музычным хітом 20-х гадоў [7, с. 290, 408]. Навукоўцы з усёй Польшчы імкнуліся трапіць на магілу Яна Снядэцкага, рэктара Віленскага ўніверсітэта, вядомага матэматыка і астранома. Ён быў пахаваны ў 1830 г. ў мястэчку Яшуны Віленскага ваяводства.

Амаль у кожным мястэчку знаходзіліся каталіцкія святыні. Касцёл у Лагішыне быў вядомы далека за межамі Палесся, дзякуючы абразу Маці Божай – Каралевы Палесся, дакрануцца да якога марылі ўсе, хто меў праблемы са здароўем.

Вялікае захапленне выклікалі рэдкія і незвычайныя прыродныя адметнасці мястэчак. Так, напрыклад, турыстычнай візіткай Парэчча быў дуб дыяметрам 7,20 м. Ен адносіўся да найстарытнейшых дрэў Гродзенскай пушчы. У трох кіламетрах ад мястэчка Гайнаўка знаходзілася крыніца з вадою, “якая творыць цуда”. Усе турысты набіралі там ваду падчас падарожжаў. Гэтым Гайнаўка стала вядомай турыстычнай кропкай на шляху да Белавежскай пушчы [7, с. 290, 408].

Аматараў зімняга адпачанку прываблівалі пушчы. Папулярнымі для наведвальнікаў Віленшчыны былі маршруты: *Руднікі–Яшуны–Рудніцкая пушча* (аднадзённы); *Падброддзе–Лаварышская пушча–Браслаў–Браслаўскія азеры–Друя* (двухдзённы).

Лясны масіў (т.з Камайская пушча плошчай 11.000 га) на шляху да мястэчак Тверач, Гайдуцішкі і Камаі стаў у 1927-1939 гг. вядомым месцам для прыхільнікаў самастойнага кемпінгу. Менавіта мястэчка Камаі і Камайская пушча лічыліся значнымі асяродкамі пражывання рысей, куды штогод з’язджалася нямала паляўнічых [8, с. 17].

Маршрут з Вільні да Налібоцкай пушчы праходзіў праз мястэчкі Баруны, Гальшаны, Вішнева, Валожын, Івянец і Іўе. Мястэчка Налібокі, дзякуючы наведвальнікам пушчы, пераўтварылася ў сапраўдны турыстычны цэнтр, у якім штомесяц знаходзілі начлег і харчаванне да 70 падарожнікаў. Дабіраліся турысты да Налібоцкай пушчы пераважна аўтобусамі, якія курсіравалі ў адзначаных мястэчках круглы год.

Школьнікі з розных гарадоў Польшчы масава наведвалі мястэчкі. Кожная навучальная ўстанова імкнулася ўключыць у вучэбны працэс пазнавальна-адукацыйныя экскурсіі, а ў летні перыяд дзеля прапаганды спорту арганізаваць турыстычныя паходы. У польскіх школах распрацоўваліся падрабязныя турыстычныя карты і рэкамендацыі па арганізацыі турыстычных паходаў і вучэбных экскурсій для моладзі. Напрыклад, такія карты існавалі для водных маршрутаў па Браслаўскім азёрам (ад возера Дрысвяты да мястэчка Друя), па рацэ Дзісна (ад возера Дзісна да самой Дзісны), а таксама для сухапутных маршрутаў (Дзісна–Глыбокае; Вільня–Ашмяны–Гальшаны–Валожын–Івянец) [9, с. 57].

Палескія мястэчкі былі вельмі папулярнымі сярод вучнеўскай моладзі падчас правядзення святочных мерапрыемстваў у рамках акцыі “Дні Палесся”, якая праводзілася штогод з 22.07 па 07.09. Адным з цэнтральных гарадоў акцыі быў Пінск. Адтуль можна было параходам, чыгункай, аўтобусам ці фурманкай трапіць у Целяханы, Лагішын, Гарадную, Пагост Загародскі, Мікашэвічы і Лахву. Падчас святочных мерапрыемстваў “Палескі кірмаш” адзначаныя мястэчкі ў жніўні 1937 г. наведала каля 1000 турыстаў [10, с. 80]. У Лагішыне мясцовыя жыхары знаёмілі моладзь з працэсам дабычы крэйды, якую местачкоўцы выкарыстоўвалі для бялення хат і прадавалі па Палескаму ваяводству. У Гарадной усе жадаючыя мелі магчымасць папрацаваць на ганчарным крузе і набыць памятныя падарункі, бо мястэчка лічылася «сапраўдным запаведнікам ганчарства» на Палессі. У мястэчку Пагост Загародскі школьнікі пашыралі свае веды па біялогіі і гісторыі. На беразе мясцовага возера знаходзілася досыць рэдкая калонія плывучага вадзянога арэха – аднагадовай травяной расліны, якую палешукі спажывалі ў ежу. Там жа непадалеку знаходзілася старажытная стаянка эпохі неаліту, аб якой распавядалі на ўроках гісторыі. У мястэчку Мікашэвічы вучні наведвалі адну з буйнейшых на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Польшчы фанерную фабрыку.

Трывалай традыцыяй для вучнеўскай моладзі быў летні адпачынак на берагах рэк і азёр у Азёрах, Воўпе, Нарачы, Браславе, Беліцы, Ігналіне, Свіры, Відзах, Плісе, Друі і Міёрах. Такі адпачынак быў самым танным, бо ежа гатавалася на вогнішчы, а начавалі ў наметах.

Не меньш пазнавальным быў неарганізаваны турызм. Самастойных падарожнікаў і падарожжаў было шмат. Выезд у бліжайшыя мястэчкі ў летні час быў надзвычай папулярным сярод жыхароў Вільні. Сеўшы на чыгунку з Вільні можна было хутка даехаць да мястэчак Алькенікі, Дзевянішкі, Падброддзе, Паставы, Ляндварава, Мейшагола, Нямечын і Тургелі. Турыстам для агляду прапаноўваліся шматлікія помнікі дряўлянай архітэктуры XVII – XVIII ст., шляхецкія сядзібы і замкі. У Паставах, дарэчы, можна было арэндаваць аўтобус (на 18 месцаў) і накіравацца на возера Нарач. У сваю чаргу кожны местачковец марыў трапіць у Вільню – культурную сталіцу Заходняй Беларусі.

Аматары самастойнага адпачынку нярэдка карысталіся турыстычным маршрутам з Вільні ў мястэчка Валожын, праз Ашмяны і Гальшаны. Добрая аўтобусная камунікацыя дазваляла за адзін дзень дабрацца да Ашмян і з любой кропкі маршрута вярнуцца зноў у Вільню. Пры наяўнасці часу турысты наведвалі мястэчкі Івянец, Крэва ці Налібоцкую пушчу.

Мястэчкі былі цэнтрамі воднага турызму. Мястэчка Азёры называлі асяродкам воднага спорту на Беласточчыне. Водная прастора Азёр (затока в. Кань, азёры Рыбніца, Белае) актыўна выкарыстоўвалася польскімі таварыствамі для арганізацыі летніх спаборніцтваў, а таксама байдарачнікамі, якія сплаўляліся да Друскенік. Дабіраліся да мястэчка чыгункай, якая хадзіла 1 раз у тыдзень і аўтобусам – тры разы ў тыдзень. Вучні гродзенскай гімназіі імя А. Міцкевіча кожнае лета прыязжалі на адпачынак у Азёры. У канцы вуліцы Рыбацкай быў зроблены пляж, дзе адпачывалі яго наведвальнікі. Там жа быў пірс, дзе можна было набыць на пракат лодку ці каяк.

Вядомымі курортнымі цэнтрамі сталі мястэчкі Браслаў і Нарач. Возера Нарач палякі называлі “віленскім морам”, Браслаўшчыну – жамчужынай віленскага Паазер’я. Турыстам прапаноўвалася пагуляць па беразе, схадзіць на рыбалку, наведаць мясцовыя санаторыі, кафэ ці рэстараны. Дзякуючы турыстам, самым даходным для вулічных гандляроў ў Нарачы і Браславе быў гандаль кветкамі. Мясцовая прэса штотыдзень пісала аб плануючых экскурсіях на возера Нарач з розных куткоў Беларусі. Так, напрыклад, у газеце “Навагрудскі Кур’ер” асобная калонка была прысвечана турыстычным аб’явам. У нумары за 6 жніўня 1936 г. можна знайсці такую аб’яву для турыстаў: “9 жніўня запланавана паездка на возера Нарач. Адпраўленне з Вільні аўтобусам ў 6.00, вяртанне ў Вільню 9 жніўня ў 22.00. Збор на вуліцы Міцкевіча, 32. Недоўгія прыпынкі запланаваны ў мястэчках Міхалішкі і Свір. Кошт экскурсіі – 9 зл. За дадатковую аплату магчыма атрымаць абед на возеры Нарачы (1,50 зл. за 1 асобу), катанне на лодцы – 0,30 зл. з чалавека за 1 гадзіну часу, на каяке – 0,20 зл. за 1 гадзіну. Жадаючым просьба запісацца да 8 мая да 15.00” [11, с. 6].

Папулярным сярод спартсменаў і простых аматараў быў байдарачны і каячны спорт. Сплаўляліся па Нёману, Котры, Дзісне, Дзвіне, Шчары, часта па Віліі і яе прытоках. У мястэчку Азёры з возера Белага пачынаўся вядомы каячны маршрут: воз. Белае – воз. Рыбніца – р. Котра – р. Нёман працягласцю 104 км. Пераадолець такі маршрут можна было за чатыры дні. Месцамі адпачынку і начлегу былі мястэчкі Парэчча, Скідзель, Масты. Фінішнай кропкай трасы мог быць горад Друскенікі ці Гродна [8, с. 88]. Не меньш значным водным маршрутам па Беласточчыне быў “шлях імя Людвіка Нарбута” ад мястэчка Марцінканцы праз Гродна да Друскеннік праз рэкі Груда, Ула, Меражанка, Котра, Неман [12, с. 45].

У мястэчку Ігналіна на Віленшчыне нярэдка праводзіліся спартыўныя заплывы на байдарках. Кожны год чыгунка, што рухалася па напрамку *Вільня–Турмонт–Свянцяны–Падаброддзе,* прывозіла ў Ігналіна спартыўныя каманды з усей Польшчы. Местачковыя азёры прываблівалі не толькі байдарачнікаў, але і рыбакоў. Тым больш, што менавіта ў Ігналіне можна было ўбачыць прыродны феномен “возера ў возеры”. На возеры Балуошас знаходзіцца востраў Ілгасале, на якім таксама ўтварыўся даволі глыбокі вадаём. Паглядзець на феномен можна было толькі на водным транспарце [8, с. 92].

Набіраў сваю папулярнасць і лыжны спорт, тым больш, што цэны на зімовы адпачынак у Заходняй Беларусі былі самымі таннымі ва ўсей Польшчы. Камунікацыйныя магчымасці рэгіёна значна ўскладняліся працяглымі снежнымі і марознымі зімамі. Абсталяваных спускавых трас у Заходняй Беларусі не было, лыжны спорт лічыўся бе-

гавым, пераважна па раўніннай мясцовасці без доўгіх пад'ёмаў і шматкіламетровых спускаў. Аднак, пакатацца на лыжных трасах Віленшчыны падчас турыстычнай акцыі "Тыдзень зімовага спорта" прыязджалі нават з Варшавы і Заходняй Польшчы. Зімовыя экскурсіі на лыжах цікавілі гараджан з Вільні, Гродна, Навагрудка, Ліды, Брэста. Самымі распрацаванымі маршрутамі зімовага адпачынку для аматараў лыж лічыліся маршруты па прыгарадам Вільні на адлегласць да 6-7 кіламетраў. Лыжнікі рухаліся арганізаванымі групамі па 4-5 чалавек. Траса па маршруту з Вільні да мястэчка Ляндварава (5 км) пераадольвалася за 2,5 гадзіны з адным адпачынкам у 30 хвілін [13, с. 61].

Для прафесійных лыжнікаў існавалі і больш працяглыя маршруты. Траса *Вільня–Гудагай–Жупраны–Солы* працягласцю 123 км пераадольвалася за два дні з дзвума працяглымі адпачынкамі. З Вільні да станцыі Гудагай лыжнікі дабіраліся чыгункай Вільна–Маладзечна. Далей ад станцыі Гудагай на лыжах на паўночны-усход лыжнікі накіроўваліся да мястэчка Жупраны (33 км), дзе быў начлег і вячэра. Наступным этапам лыжнага пуці быў шлях на ўсход ад Жупран да мястэчка Солы працягласцю 45 км, які пераадольваўся за 6-7 гадзін. У Солах лыжнікі чакалі на чыгунку да Вільні [13, с. 69]. Не меньш папулярныямі лыжнымі трасамі былі: *Вільна–Падброддзе–Нямечын–Вільна, Вільня–Гальшаны–Крэва–Гальшаны, Вільня–Ігналіна–Свянцяны, Вільня–Браслаў–Дрысвяты,* якія садзейнічалі развіццю гандлю і сферы паслуг у мястэчках.

Сацыяльная інфраструктура мястэчак развівалася не такімі тэмпамі, як узрастаючыя запатрабаванні розных катэгорый турыстаў. Арганізацыя харчавання у мястэчках была досыць разгалінаванай. Смачныя і досыць танныя абеды і вячэры прапаноўваліся ў барах і буфетах, корчмах і кавярнях, рэстаранах і сталовых. Шырокі асартымент тавараў на рынку, у яўрэйскіх лаўках і польскіх крамах сапраўды ўражваў нават самых прыдзірлівых наведвальнікаў. Арганізацыя начлегу, наадварот, была справай слабавырашальнай для турыстаў, асабліва тых, якія прыязджалі на адпачынак арганізаванымі групамі. Праблема фактычна была невыканальнай для груп ад 50 чалавек і болей. Турысты сярэдняга дастатку, як правіла, выбіралі адпачынак у гасцініцах, сярэдні кошт пакоя ў якіх складаў ад 2 да 8 злотых за ноч. Большасць гасцініц і гасцінных двароў былі маламеснымі, пераважна на 10-15 ложкаў, але і такія гасцініцы былі не ў кожным мястэчку.

Праблему з размяшчэннем турыстаў вырашылі летнікі, турбазы, інтэрнаты і пансіянаты, якія пачалі масава з'яўляцца ў 30-я гг. XX ст. У іх можна было знайсці танны начлег да 2 зл. за ложак. Прэса і рэклама такія месцы адпачынку называлі турыстычнымі гатэлямі. Яны ўзнікалі пераважна на базе навучальных устаноў, аднак і простае грамадства актыўна ўключалася ў працэс іх арганізацыі. Так, напраклад, некалькі яўрэйскіх сямей з мястэчка Мілейчыцы на Беласточчыне здавалі ў арэнду турыстам 20 летніх дач, агульнай колькасцю 200 пакояў, сярод якіх было 13 камфартабельных віл. Сярэдні кошт пакоя складаў ад 25 да 30 зл. у месяц без пасцелі і абслугоўвання. Крыніцы адзначаюць, што за 1933-1937 гг. сярод гасцей Мілейчыц было 1500 чалавек з Беластока, Бельска, Ваўкавыска, Семяціч, Варшавы [14, с. 184].

У трох кіламетрах ад мястэчка Кабылінікі на беразе ракі Нарач у 1933 г. быў пабудаваны летнік для турыстаў на 100 ложкаў, які належаў Віленскай школьнай акрузе. Гэта быў асобны будынак з індывідуальнымі (на 1-2 ложка) і агульнымі пакоямі (на 10-15 ложак). За начлег дарослыя плацілі 1 зл., дзеці – 50 гр. Дадаткова бралася аплата за карыстанне бялізнай – 40 гр. У школьнага летніка была свая прыстань на 5 лодак і 40 каякоў, якія здаваліся ў арэнду [15, с. 19].

Летнія домікі для адпачынку, якія ўтрымліваліся мясцовымі школамі, у 1929-1939 гг. былі арганізаваны ў мястэчках Азёры (на 30 ложкаў), Драгічыне (30 ложкаў), Браславе (20 ложкаў), Дзісне (20 ложкаў), Жодзішках (10 ложкаў), Міхалішках (10 ложкаў), Друі (10 ложкаў), Міры (10 ложак) і інш. Кошт начлегу ў іх складаў 20 грошей за адно спальнае месца.

У мястэчку Масты на Гродзеншчыне ў лясным масіве была пабудавана турбаза для турыстаў, якія сплаўляліся на байдарках па Нёману і Шчары. Такія турбазы для байдарачнікаў былі пабудаваны ў Орлі і Быцені на Навагрудчыне. Нельга не адзначыць, што на Палессі польскім уладам да 1939 г. удалося пабудаваць каля 40 турыстычных прытулкаў

для начлегу байдарачнікаў па найбольш папулярным маршрутам [16, с. 51].

Прыватнаўласніцкіх сядзіб і маенткаў у Заходняй Беларусі, якія абслугоўвалі выключна турыстаў было каля 45 [16]. Маёнткі і сядзібы, як правіла, знаходзіліся ў лясных і паркавых зонах, недалека ад рэк і азёр, змяшчалі ўсе неабходнае для камфортнага пражывання. Так, напрыклад, маёнтак, што размешчаны ў 4 км ад мястэчка Вішнева на Віленшчыне, мог прыняць да 15 адпачываючых. Каля маёнтка знаходзіўся штучны вадаём, на якім зімой ладзіўся каток, а летам была магчымасць загараць і купацца. Уладальнік маёнтка Я. Шаняўскі арганізаваў для турыстаў шмат забаўляльных праграм. За дадатковую аплату ўсе жадаючыя маглі наведаць замкі у Крэве і Гальшанах ці стаць удзельнікамі палявання на заўцоў. Бясплатна прапаноўваліся лыжы, санкі, конныя прагулкі, збіранне грыбоў і ягад. Кошт начлега складаў 3-4 зл. (2 зл. для дзяцей), прапаноўвалася 4-х разовае харчаванне. Сем'і з малымі дзецьмі да 3 гадоў не прымаліся [16, с. 19].

Пансіянат “Котра” пры ўездзе ў мястэчка Скідзель знаходзіўся ў жывапісным месцы на беразе ракі Котры. Для турыстаў бясплатна прапаноўваліся пляжны адпачынак, катанне на каяках ці маторных лодках. Уладальніца сядзібы В. Даманьская з 01.06 да 01.10 штомесяц прымала 25 гасцей, якія размяшчаліся ў 1, 2-х ці 3-х месных пакоях. За дадатковую аплату можна было наведаць Гродна і Друскенікі. Аплата за пражыванне ў аднамесным пакоі складала 100 зл. у месяц, у двух ці трохмесных пакоях – 90 зл. У пансіянаце арганізоваўваліся вячэрнія кінасеансы і быў тэлефон. Прымаліся сем'і з немаўлятамі і асобы незалежна ад іх рэлігійнага веравызнання [16, с. 25].

Мястэчкі былі ўключаны ў аўтамабільны і велатурызм. Аўтамабілі былі слабасцю забяспечаных і захопленых людзей. Паляпшэнне шляхоў зносін, арганізацыя дарожнага руху, выданне шляхаводнікаў з картамі дарог па Заходняй Беларусі спрыялі развіццю аўтамабільнага і велатурызма. Удзельнікі аўтаклубаў цэнтральных ваяводстваў Польшчы перыядычна праводзілі аўтазлёты на возеры Нарач і Браслаўскіх азёрах. У Нарачы і Браславе для такіх злётаў здаваліся ў арэнду гаражы. У 1937 г. на Нарачы прашоў XI Міжнародны польскі аўтапрабег, у якім ўдзельнічалі 67 машын з розных краін [5]. Яшчэ адным папулярным месцам для аўтазлётаў стала мястэчка Друя, што знаходзілася каля самай мяжы з Латвіяй. У польскіх газетах нярэдка адзначалася, што правядзенне аўтазлётаў у Друі непакоіла савецкую разведку.

**Высновы.** Мястэчкі, якія колькасна пераўзыходзілі гарады, валодалі комплексам культурна-гістарычных, прыродных, сацыяльна-эканамічных, транспартных рэсурсаў, сукупнасць якіх актыўна выкарыстоўвалася польскай дзяржавай, мясцовым самакіраваннем і местачкоўцамі для развіцця турызму.

Турызм у мястэчках Заходняй Беларусі ў 20-30 гг. XX ст. нельга назваць масавым. Адна з галоўных прычын гэтага – неразвітасць транспартнай сеткі і сацыяльнай інфраструктуры. Аднак, нават пры такіх умовах, значная колькасць заходнебеларускіх мястэчак сталі турыстычнымі асяродкамі і арганічна ўпісаліся ў праграмы найбольш прадаваемых пешых і водных тураў па Заходняй Беларусі.

Дзякуючы ўсім намаганням, якія былі зроблены па развіццю турызму ў заходнебеларусім рэгіене, у мястэчках атрымалі распаўсюджванне наступныя яго віды: *паводле спосабу перамяшчэння* – актыўны (пешы, лыжны, веласіпедны, водны) і пасіўны (чыгуначны, аўтобусны, аўтатурызм), *паводле мэтавага прызначэння:* пазнавальны і настальгічны (азнаямленне з помнікамі архітэктуры, музеямі, гістарычнымі мясцінамі, мемарыяльнымі аб'ектамі); спартыўны (турызм як від спорту); агратурызм (паездкі ў пансіянаты, летнікі, маёнткі і сядзібы; адпачынак на прыродзе); забаўляльны (наведванне выстаў, кірмашоў, спартыўных спаборніцтваў, прамысловых прадпрыемстваў і інш.), *паводле ўзросту турыста* – дарослы і дзіцячы; *паводле колькасці ўдзельнікаў* – індывідуальны і групавы; *паводле формы правядзення* – самадзейны і арганізаваны; *паводле месца правядзення* – унутрыдзяржаўны (гарадскі і сельскі) і міжнародны.

**Спіс літаратуры**

1. Вайцешчык, Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук / Г. С. Вайцешчык. – Гродна, 2013. – 25 с.

2. Ганский, В.А. Туризм в Западной Беларуси (1921-1939 гг.) / В.А. Ганский. – Даугавпилс: Латгальская академия, 2017. – 216 с.
3. Ганскі, У. А. Турыстычныя маршруты ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / У. А. Ганскі, І. І. Калачова // Веснік Баранавіцкага дзярж. ун-та. Сер. гіст. навукі і археалогія. Эканам. навукі. Юрыд. навукі. – 2017. – Вып. 5. – С. 13–18.
4. Ильин, А. Л. Развитие туризма на территории Полесского воеводства в 30-х гг. XX века / А. Л. Ильин, П. Цихорацкий // Туризм и гостеприимство. – 2018. – №1. – С. 48-55.
5. Шиталь, К. Дикая природа Западной Беларуси: куда ездили туристы 100 лет назад? / К. Шиталь, И. Мельников, В. Садовский / Go to Belarus (туристический проект) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://34travel.me/gotobelarus/post/zahad. – Дата доступа: 19.10.2017.
6. Śleszyński, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków: Avalon, 2014. – 335 s.
7. Orłowicz, M. Przewodnik ilustrowany po województwie Białostockim / M. Orłowicz. – Białystok: Związek Poperania Turysryki województwa Białostockiego, 1937. – 477 s.
8. Shukiewicz, J. Przewodnik turystyczny po Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie / J. Shukiewicz. –Wilno: Znicz, 1934. – 36 s.
9. Ганский, В. А. Основные направления развития туризма в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / В. А. Ганский // Науковий вісник Миколаївського нац. ун-ту ім. В. О. Сухомлинського. Іст. науки. – 2017. – Вип. 2 (44). – С. 53–59.
10. Sprawozdanie Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich: z działalności w drugim okresie sprawozdawczym 11.X.36-22.V.38. – Warszawa, 1938. – 156 s.
11. Kurjer Nowogródski. – 6 sierpnia. – 1936.
12. Kulesza, T. Druskieniki i okolice: przewodnik turystyczny. – Grodno: Wydaw-wo Towarzystwa Przyjaciół Druskienik, 1935. – 193 s.
13. Grabowecki, J. Przewodnik narciarski po terenach Wileńszczyźny / J. Grabowecki. – Wilno: Związek Propagandy Turystycznej Ziemi Wileńskiej, 1937. – 205 s.
14. У новай айчыне. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд / пад рэд. В. Луба. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Ніва, 2001. – 300 с.
15. Касяноўская, Г. С. Дзейнасць польскіх навуковых устаноў па вывучэнню заходнебеларускага рэгіёна ў 1921–1939 гг./ Г. С. Касяноўская // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя. – 2018. – № 2. – С.12-20.
16. Wakacje we dworach na Ziemiach Wschodnich. – Warszawa: nakł. Sekcja Turystyki T-wa Rozwoju Ziem Wschodnich, 1937. – 38 s.

**References**

1. Voiteshchik A.S. *Mestechki Zapadnoj Belarusi (1921-1939 gg.): sotsialno-ekonomicheskoe i kulturnoe razvitie* [Townships of Western Belarus (1921-1939): socio-economic and cultural development]. Abstract of Ph. D. History, Grodno, 2013, 25 p. (In Belarusian)
2. Ganskij V.A. *Turizm v Zapadnoj Belarusi (1921-1939 gg.)* [Tourism in Western Belarus (1921-1939)]. Daugavpils, Latgale Academy Publ, 2017, 216 p. (In Russian)
3. Ganskij V.A., Kolocheva I.I. Turisticheskie marshruty v Zapadnoj Belarusi (1921-1939 gg.) [Tourist routes in Western Belarus (1921-1939)]. *Vestnik Baranovichskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya istoricheskie nauki i arheologiya, ekonomicheskie i yuridicheskie nauki* [Baranovichi University Review. Series: Historical, archeology, economic and legal sciences]. Baranovichi, 2017, no. 5, pp. 13-18. (In Russian)
4. Ilin A., Tsikhoratskii P. Razvitie turizma na territorii Polesskogo voevodstva v 30-h gg. XX veka [Development of tourism in the Polesie voivodship in the 30s of the XX century]. *Turizm i gostepriimstvo* [Tourism and hospitality], 2018, no. 1, pp. 48-55. (In Russian)
5. Shital K., Melnikov I., Sadovskii V. Dikaya priroda Zapadnoj Belarusi: kuda ezdili turisty 100 let nazad? [Wildlife of Western Belarus: where tourists traveled 100 years ago?]. *Go to Belarus (turisticheskij proekt)* [Go to Belarus (tourist project)]. (In Russian). Available at: https://34travel.me/gotobelarus/post/zahad. (accessed 19.10.2017)
6. Śleszyński W. *Województwo Poleskie* [Polesie Voivodeship]. – Kraków, Avalon, 2014, 335 p. (In Polish)

7. Orłowicz M. *Przewodnik ilustrowany po województwie Białostockim* [Illustrated guide to the Białystok voivodeship]. Białystok, Związek Poperania Turysryki województwa Białostockiego, 1937, 477 p. (In Polish)
8. Shukiewicz J. Przewodnik turystyczny po Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie [A tourist guide to the Vilnius and Nowogródek regions]. Wilno, Znicz, 1934, 36 p. (In Polish)
9. Ganskij V.A. Osnovnye napravleniya razvitiya turizma v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) [The main directions of tourism development in Western Belarus (1921-1939)]. *Naukovij visnik Mikolaïvs'kogo universitetu im. V. O. Suhomlins'kogo. Ist. Nauki* [Scientific Rewiew of the Nikolaev National University named after V.O. Sukhomlinsky. Series: History], 2017, no. 2 (44), pp. 53-59. (In Russian)
*10. Sprawozdanie Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich: z działalności w drugim okresie sprawozdawczym 11.X.36-22.V.38.* [Report of the Society for the Development of Eastern Territories: on activities in the second reporting period 11.X.36-22.V.38.]. Warsaw, 1938, 156 p. (In Polish)
*11. Kurjer Nowogródzki*, 1936, 6 sierpnia. (In Polish)
12. Kulesza T. Druskieniki i okolice: przewodnik turystyczny [Druskininkai and its surroundings: a tourist guide]. Grodno, Towarzystwo Przyjaciół Druskienik, 1935, 193 p. (In Polish)
13. Grabowecki J. Przewodnik narciarski po terenach Wileńszczyźny. [A ski guide to the Vilnius region]. Vilnius, Związek Propagandy Turystycznej Ziemi Wileńskiej, 1937, 205 p. (In Polish)
14. Luba V. *U novaj ajchyne. Shtodzyonnae zhyccyo belarusaў Belastochchyny ў mizhvaenny peryyad* [In the new homeland. Daily life of Belarusians in Bialystok region in the interwar period] Eds. Luba V. Białystok, Niva Weekly Program Council, 2001, 300 p. (In Russian)
15. Kasyanovskaya A.S. Dzejnasc' pol'skih navukovyh ustanoў pa vyvuchennyu zahodnebelaruskaga regiyona ў 1921–1939 gg. [The activities of Polish scientific institutions for the study of the Western Belarus in 1921-1939] *Vestnik Grodnenskogo gosudarstvennogo universiteta imeni Yanki Kupaly* [Review of the Yanka Kupala State University of Grodno. Series: History, Vol. 1], 2018, no.2, pp. 12-20. (In Belarusian)
16. *Wakacje we dworach na* Ziemiach Wschodnich [Holidays in mansions in the Eastern Territories]. Warsaw, Sekcja Turystyki T-wa Rozwoju Ziem Wschodnich, 1937, 38 p. (In Polish)

*Received 2 April 2021*